**Літаратура**

1. Гарэцкі М. Збор твораў: у 4 т. // М. Гарэцкі. – Мінск: Маст. літ., 1984–1986. – Т.2: Аповесці. Драматычныя абразкі. – 1985. – 416 с.
2. Мушынскі М. Падзвіжнік з Малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага // М. Мушынскі. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 510.

***Тацццяна Лабада***
*(Мінск)*

## МАКСІМ І ЛЕЎ БАГДАНОВІЧЫ Ў ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ: ПОГЛЯД З ТЫЛУ І ФРОНТУ

Першую сусветную вайну сучаснікі называлі Вялікай вайной. Насамрэч, гэта была маштабнейшая ваенная катастрофа. Стаўленні да яе ў грамадзян Расійскай імперыі ваганіся ад патрыятычна-ўзвышаных да непрымальных. Звязана гэта было з рознымі акалічнасцямі, у тым ліку са шматнацыянальным і разнаканфесійным складам насельніцтва краіны, з палітычнымі прыхільнасцямі і сімпатыямі. Нярэдка ўнутры адной сям'і маглі складвацца супрацьлеглыя стаўленні да падзей, у якія была ўцягнута Расійская імперыя. Дарэчы, многія прадстаўнікі інтэлігенцыі на працягу вайны змянялі сваё стаўленне. Сёння мы можам разважаць пра гэта, дзякуючы іх успамінам, мастацка-дакументальным творам і эпісталярнай спадчыне.

У гэтым рэчышчы цікава прасачыць, як ставіліся да падзеяў вайны ў сям'і інтэлігента і народавольца Адама Ягоравіча Багдановіча, беларуса па паходжанні, але чалавека, які скіраваў свой погляд у адносінах да будучыні радзімы толькі як на паўночна-заходні край Расійскай дзяржавы.

На пачатак Першай сусветнай вайны ў яго сям'і было два сыны, якія дасягнулі прызыўнога ўзросту. Але абодва – і Максім, і Леў – не адзначаліся моцным здароўем. З-за сухотаў яны мелі адтэрміноўку па мабілізацыі. Ніводны з хлапцоў нават не задумваўся над кар'ерай вайскоўца.

Максім Багдановіч у гэты час спасцігаў не моцна любыя сэрцу прамудрасці ў Дзямідаўскім юрыдычным ліцэі Яраслаўля. Яго малодшы брат Леў – бліскуча вучыўся ў Маскоўскім універсітэце на фізіка-матэматычным факультэце. Ніводнаму з іх не ўдалося перажыць Першую сусветную вайну. Максім у маі 1917 г. памер ад сухотаў у Ялце. А Леў – пад час знаходжання ў шпіталі ў Кіеве, па ўсёй верагоднасці на некалькі месяцаў больш, чым праз год (дакладную дату ўстанавіць пакуль не ўдалося).

Пра стаўленне братоў Багдановічаў да сусветных падзеяў, якія разгарнуліся вакол сербскага канфлікту няма іх прамых сведчанняў, але захавалася эпісталярная спадчына сям'і Багдановічаў (заходдзіцца ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча і Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва). Менавіта яна стала дакументальнай крыніцай у вызначэнні стаўлення да Першай сусветнай вайны Льва Багдановіча. Максім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ